# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА ЖЫЦЦЯЗАБЕСПЯЧЭННЯ ДЗЯЦЕЙ У БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XX стст.)

Якубінская А.Дз.,
кандыдат гістарычных навук., дацэнт

Працэс сацыялізацыі чалавека пачынаецца з моманту яго нараджэння і працягваецца ўсё жыццё. У кожным грамадстве дзіця нараджаецца з пэўнымі біялагічнымі ўласцівасцямі, якія культура гэтага грамадства выкарыстоўвае па-свойму, фарміруючы неабходны тып паводзінаў чалавечай асобы. Перш за ўсё, чалавек забяспечвае вырашэнне праблем, якія ўзнікаюць з асабістых патрэб яго арганізма. Кожны народ выкарыстоўвае ўласныя сродкі задавальнення “базавых патрэб чалавека”, якія складаюць комплекс “культуры першаснага жыццязабеспячэння” [10, с. 41]. “Самым важным у фарміраванні асобы чалавека і ў яго сацыялізацыі з’яўляецца вопыт, атрыманы ў раннім дзяцінстве”, які набываецца “па меры таго, як чалавек корміць і даглядае сваё дзіця” [8, с. 252]. Вопыт ранняга дзяцінства заснаваны на вырашэнні такіх першасных (базавых) патрэб чалавечага арганізму, як харчаванне, адзенне, гігіена і лячэнне, авалоданне тэхнікай цела. Задавальняючы гэтыя базавыя патрэбы, беларускія сяляне ў другой палове XIX – першай палове XX стст. ажыццяўлялі прыстасаванне дзяцей да здаровага ладу жыцця, выхаванне паўнавартасных членаў сялянскай грамады. Такім чынам, для жыццязабеспячэння дзяцей у першую чаргу неабходна існаванне адпаведнага дзіцячага харчавання, дзіцячага адзення, спосабаў і сродкаў прафілактыкі і лячэння дзіцячых хвароб, спецыяльных спосабаў і сродкаў для авалодання дзецьмі тэхнікай цела.

У беларусаў ад нараджэння адзінай ежай немаўлят было матчына малако. Немаўляці звычайна давалі адну грудзь за адно кармленне, але калі дзіця падрастала да 4-6 месяцаў, то яму маглі даць за адно кармленне і абедзве грудзі. Дзіця аднімалі ад грудзей, калі яно ўжо ўсё разумела і магло размаўляць. Мацярынскае малако паступова замянялася на кароўе ці казінае малако [2, с. 8]. У перапынках паміж ежай дзіцяці давалі “сусла” – кавалак жаванага хлеба, часам з цукрам, увязаны ў спецыяльную чыстую анучку. Калі дзіця

пачынала поўзаць, яму ўводзілі дадатковую ежу – прыкорм. Першымі прадуктамі, якія ўводзіліся ў рацыён дзіцяці, былі яешня, малочныя кашы: пшанічная, грэцкая, аўсяная, ячменная, канапляная, а таксама хлеб. Так адбывалася далучэнне дзяцей да традыцый народнага харчавання беларусаў, аснову якога складаюць раслінныя стравы з круп, гародніны, мукі [12, с. 17-18]. Спецыяльнага посуду для гатавання дзіцячых страў амаль не існавала. Праўда, М.Я. Нікіфароўскі ўзгадвае так званы "горнушак" – сасуд невялікага памеру з адной ці дзвюма ручкамі, які выкарыстоўваўся спецыяльна для прыгатавання дзіцячых "кашачак" [13, с. 89]. Калі дзіця падрастала, давалі і сырое яйка з прабітай ў шкарлупіне дзірачкай, праз якую дзіця яго высмоктвала [2, с. 14]. Вельмі карысным лічыўся свежавыціснуты сок з багатых жалезам чырвоных і чорных ягад парэчкі, багатае на фоліевую кіслату сырое салёнае сала, сырыя і печаныя яблыкі, сырая морква, асабліва падчас прарэзвання зубоў [2, с. 2]. Сярод дзіцячых страў пераважалі печаныя і вараныя, сырая садавіна і гародніна, мяса ўжывалася даволі рэдка і ўводзілася ў рацыён, калі дзіцяці было каля аднаго году. Працэдура кармлення ўключала жаванне яды перад тым, як даць яе дзіцяці, забаранялася карміць дзіця з лыжкі "наводміж" (навотмаш), бо лічылася, што гэта можа выклікаць незварэнне, таму дзіця павінна сядзець злева [3, с. 9]. Дзеці ў трохгадовым ўзросце елі ўсе стравы, што і дарослыя. Такім чынам, у беларусак склалася даволі дасканалая тэхніка кармлення, аб чым сведчыць і той факт, што працягласць кармлення грудным малаком складала 1,5 – 2 гады, пры досыць раннім уводзе дадатковай "дарослай" ежы – прыкорму.

Беларускія сяляне імкнуліся да таго, каб у рацыёне дзяцей любога ўзросту пераважалі малочныя стравы, асабліва карысным лічылася парное кароўе ці казінае малако. Зімой дзеці разам з дарослымі садзіліся есці тры разы, а летам – чатыры разы ў дзень. Таксама дзеці ў перапынках паміж асноўнымі прыёмамі ежы елі кавалкі хлеба, замочаныя ў малацэ ("рулі") ці квасе ("цупа", "патапцы"), у заходніх рэгіёнах Беларусі дзеці ўжывалі "каплун" – кавалкі хлеба, залітыя малаком і засмажаныя салам ці алеем з цыбуляй [7, с. 321]. Любімай стравай дзяцей былі бліны ("блінцы", "млінцы"), якіх існавала шмат відаў: з цёртай бульбы смажылі "дранікі" ("драчы"), з мукі рабілі "ўчыняныя" (з пераквашанага

цеста) бліны, таксама пяклі аладкі з грэчневай мукі. Усе віды бліноў елі з маслам, смятанай, салам, мачалі ў засмажанае яйка. Асаблівае месца ў рацыёне дзяцей належала бульбе, з якой таўклі “таўканіцу”, “кашу”, “камы”, варылі, смажылі на патэльні, запякалі (“печанка”) [7, с. 321]. Вялікае месца ў рацыёне дзяцей займалі розныя віды каш з грэчневай, пшанічнай, ячменнай і аўсянай круп, а таксама ільняное семя, з якога рабілі алей альбо таўклі крыху засмажанае семя і мачалі ў яго вараную бульбу. Вясной ежа дзяцей, як і дарослых, адрознівалася асаблівай сціпласцю, што было звязана з Вялікім пастом. Такім чынам, у беларускіх сялян адсутнічаў спецыяльны рэжым кармлення і харчавання дзяцей (акрамя немаўлят), але пэўныя асаблівасці ў дзіцячым рацыёне можна вылучыць: ужыванне дзецьмі дадатковай ежы ў перапынках паміж асноўнымі прыёмамі, перавага малочных, печаных і вараных страў з мукі, круп і гародніны, а таксама ўжыванне дзецьмі дзікарослых ягад, зяляніны і садавіны.

Галоўная функцыя вопраткі – стварыць чалавеку прыдатныя ўмовы для існавання ў навакольным асяроддзі і грамадстве. У традыцыйным грамадстве спецыфіка адзення вызначаецца палавой і ўзроставай прыналежнасцю чалавека, а змена вопраткі адзначае пераход да новай узроставай ступені. Адзенне адыгрывае значную ролю ў забеспячэнні здароўя дзяцей, бо садзейнічае фарміраванню іх правільнага і дасканалага фізічнага вобліку. Спецыфіка дзіцячага адзення беларусаў прасочваецца ў дачыненні да вопраткі дзяцей малодшага ўзросту. Найбольш старажытнай вопраткай немаўляці з’яўляецца “мятлік” – кавалак старой, мяккай, ношанай тканіны, у цэнтры якога рабіўся разрэз, каб пралазіла галава дзіцяці. Паводле ўяўленняў беларусаў мятлік меў ахоўны сэнс для дзіцячага здароўя, бо яго паходжанне было генетычна звязана з так званай “сарочкай” (калаплодным пузыром) [9, с. 47]. Такім чынам апраналі на дзіця да 4 – 6 месяцаў, адначасова загортвалі яго ў “полкі”. Звычайна для немаўляці бралі 3 пялюшкі, выраблены з паношанай бялізны бацькоў: адну для галавы (“пагалоўнік”), другую для таза – “падгузнік”, трэцюю – для загортвання ўсяго цела [14, с. 135].

Менавіта тугое спавіванне, па меркаванню сялянак, садзейнічала правільнаму фарміраванню дзіцячага цела. Апошні этап – звязванне дзіцяці “спавівачом” – тугім поясам, які звычайна абгортваў цела дзіцяці крыж-накрыж некалькі разоў. Семіятычны сэнс пояса

А.К. Байбурын вызначае наступным чынам: пояс не толькі вызначаў далучэнне новага чалавека да свету людзей, далейшае яго нашэнне было абавязковым з-за яго ахоўных функцый [6, с. 9]. Калі дзіця падрастала прыкладна да шасці тыдняў пагалоўнік замянялі чэпчыкам, які ўпрыгожвалі каляровымі стужкамі і каснікамі [3, с. 3]. Спавівалі дзіця звычайна прыкладна да шасці месяцаў, бо ў гэтым узросце дзяцей пачыналі прысаджваць і спрабавалі ставіць на ножкі. У гэтым узросце дзецям незалежна ад полу апраналі ільняныя сарочкі, але пояс яны працягвалі насіць. Дзяўчынку падвязвалі поясам на таліі або вышэй пад грудзьмі, а хлопчык насіў пояс амаль на сцёгнах, як дарослы мужчына [13, с. 116].

У XIX – першай палове XX стст. штаны і спадніцу дзеці ўпершыню апраналі ва ўзросце 5 – 6 гадоў, што было значнай падзеяй у іх жыцці і адзначала пераход да новай полаўзроставай ступені, у якой дзяцей пачыналі зваць адпаведна іх палавой прыналежнасці: хлопчыкаў называлі "блазны", а дзяўчынак – "блазноўкі". На Віцебшчыне працэс апранання першых штаноў хлопчыкам і першай спадніцы дзяўчынкам суправаджаўся рытуальнымі дзеяннямі, мэта якіх – вызначыць працягласць веку чалавека. Спецыфічных галаўных убораў у хлопчыкаў не было, а дзяўчынкі з 10 – 12 гадоў пачыналі насіць вянок. Вянок маркіраваў новы сацыяльны статус дзяўчынкі, магчыма, пачатак яе ўступлення ў шлюбны ўзрост. Асноўным галаўным уборам дзяўчынак і зімой, і летам была хустка. На ногі вязалі з ільну або авечай шэрсці шкарпэткі, абувалі лапці, больш заможныя сяляне спраўлялі дзецям "абіякі" (скураны абутак на драўлянай падэшве) ці нават боцікі.

Сярод традыцыйных спосабаў прафілактыкі хвароб самае важнае месца займала асабістая гігіена дзяцей. Гэта ў першую чаргу працэдура ўмывання і купання. Так, немаўлят купалі кожны дзень, з двух месяцаў купалі праз дзень, потым праз два дні, а потым і адзін раз у тыдзень, да трох год дзеці мыліся дома, а з трох – чатырох – у лазні: дзяўчынкі – з маці, а хлопчыкі – з бацькам [3, с. 5]. Безумоўна, лекавую накіраванасць несла звычка ліць у ваду адвары рамонка, мяты, чыстацелу, чарады. Першапачаткова малое загортвалі ў пялюшку, пад галоўку ў начоўкі клалі складзеную ў некалькі столак пялюшку ці знятую дзіцячую вопратку і дзіця апускалі ў ваду. Спачатку ваду лілі на ручкі, потым на ножкі, на жывоцік, у канцы на галоўку. У канцы практыкавалася закальванне:

дзіця бралі на рукі жывоцікам уніз, злівалі “летняй” (халаднейшай) вадой, і выцiралі чыстай полкай [3, с. 6]. Ёсць сведчанні, што пры купанні хваравітага або слабога немаўля ў ваду ўлівалі кубак малака, клалі зерне пшаніцы, а каб яно дужэла і добра расло, рабілі своеасаблівую зарадку: калена правай ножкі злучалі з левым локцем, а правы локаць з левым каленам па чарзе [2, с. 15]. Ваду пасля купання нельга было выліваць пасля заходу сонца, лепей было пакінуць на наступны дзень і выліць на ўсходзе абавязкова пад дрэўца, “каб тое дзіця расло, як дрэўца” [3, с. 6].

У традыцыйных спосабах лячэння дзіцячых хвароб вылучаюцца два накірункі – рацыянальныя сродкі – масаж, лекавыя травы і нерацыянальныя – магічныя сродкі. Вельмі часта гэтыя накірункі спалучаліся. Многія хваробы немаўлят звязваліся сялянамі з “тым” светам. Напрыклад, каб аблегчыць прарэзванне зубоў, скроні дзіцяці змазвалі сумессю матчынага малака з сокам часнаку [5, с. 12]. Пры гэтым малако трэба было “працыркнуць” праз грабеньчык [5, с. 12]. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці маці мезеным пальцам левай рукі змазвала дзясны дзіцяці мёдам, давала пагрызці жалезную лыжачку [3, с. 8]. Яшчэ адной хваробай немаўлят лічылася так званая *“шчацінка”*, якая “з’яўляецца”, на спіне дзіцяці, калі цяжарная жанчына пхне нагой хатнюю жывёлу. Лячылі “шчацінку” наступным чынам: на матчыным малацэ замешвалі невялікі кавалак цеста і качалі яго па спіне дзіцяці [3, с. 7] або клалі дзіця на тое месца, дзе ляжаў кот ці сабака і качалі яго [4, с. 5].

Досыць распаўсюджанай хваробай была *“малочніца”* (назва *“падбела”*зафіксавана ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці, *“шчэміны”* (у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці) – белы налёт на языку, дзяснах, вуснах дзіцяці. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці налёт выцiралі валасамі маці [3, с. 6], а ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці чырвоным шарсцяным касніком [2, с. 10]. Існавалі яшчэ дзве групы хвароб, якія часам атаясамліваліся, і спосабы іх лячэння былі практычна аднолькавымі – *гэта “сурокі” (“зглаз”, “пярэпалахі”, “спалох”, “някі”)* і *“начніцы” (“крыксы”, “плаксы”).* Як адзначае П.В. Шэйн, найбольш распаўсюджанымі сродкамі лячэння сурокаў з’яўляюцца наступныя: прыём прапускання дзіцяці паміж целам і кашуляй маці або праз бацькавы нагавіцы, выціранне падолам, высмоктванне ў вобласці вачэй і

сэрца, абкурванне смеццем або валасамі таго чалавека, які сурочыў [15, с. 286-288]. Напрыклад, у Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці "ад суроку" дзіця выціралі шапкай таго чалавека, які ўваходзіў у хату [4, с. 5]. Часам сурок мог спрычыніць начніцы, прыкметамі якіх сяляне лічылі вялікі жывоцік, начныя плачы і бяссонніцу. А.Я. Багдановіч апісвае цікавы абрад лячэння начніцаў – "паланне" дзіцяці: маці кладзе дзіця ў прыпол і некалькі разоў качае яго перад полымем печы. Грыжу таксама лячылі замовамі, абвязаўшы жывоцік дзіцяці чырвонай ніткай, якая, магчыма, сімвалізавала ахоўную сілу пояса [3, с. 10].

У Себежскім павеце Віцебскай губерні, калі бабка-павітуха выяўляла ў дзіцяці прыкметы грыжы, яна лавіла мыш, разрывала яе за заднія лапкі і прыкладала яе да грыжы [1, с. 136]. Такі магічны спосаб лячэння пры дапамозе хтанічнай жывёлы сведчыць аб успрыманні нованароджанага як прадстаўніка "таго свету", таму і хвароба, з якой ён нарадзіўся, павінна была пакінуць яго са смерцю прадстаўніка "таго свету" – мышы. Як ужо адзначалася вышэй, разам з выкарыстаннем замоў і іншых магічных сродкаў сялянкі звярталіся таксама і да лячэння "зёлкамі". Налічваецца каля 300 відаў раслін, якія выкарыстоўваліся беларусамі для лячэння, найвялікшую групу сярод іх складаюць расліны для лячэння страўнікавых захворванняў.

Такім чынам, у прафілактыцы і лячэнні дзіцячых хвароб праяўляўся сінкрэтызм традыцыйнага беларускага сялянскага светапогляду. Лячэнне некаторых хваробаў немаўлят, звязаных з асаблівасцямі развіцця дзіцячага арганізма, адбывалася пры дапамозе малака маці, яе валасоў ці вады з яе роту, альбо пры дапамозе мацярынскага сімвала – печы.

Прыстасаванне чалавека да навакольнага асяроддзя адбываецца пры дапамозе біякультурнай адаптацыйнай стратэгіі, якая складаецца з узаемазвязаных біялагічных і культурных спосабаў прыстасавання да навакольнага асяроддзя, у тым ліку фізічнага выхавання дзіцяці першага году жыцця [17, с. 140]. У беларусаў склаўся своеасаблівы комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне дасканалага фізічнага і псіхічнага стану дзіцяці – гэта "*матчына гімнастыка"*. Матчына гімнастыка складалася з наступных дзеянняў з дзецьмі: прысаджванне, стаўленне на ножкі, ваджэнне за ручкі, саджанне на ўлонні, масаж пасля купання

дзіцяці. Для фарміравання ў дзяцей навыкаў сядзення, стаяння, хадзьбы ў беларускіх сялян існавалі спецыяльныя спосабы і сродкі для авалодання дзецьмі тэхнікай цела, сярод якіх важную ролю адыгрывала традыцыйная дзіцячая мэбля. Першым уласным "домам" дзіцяці была *"калыска" ("люлька","зыбка", "калюбель", "калібка")*, куды яго клалі толькі пасля хрышчэння. Калыскі складаюць самую вялікую групу сярод дзіцячай мэблі. Т.Дз. Яцкевіч падзяляе іх па спосабе гушкання на дзве катэгорыі: зыбкі (гушкаліся зверху ўніз) і калыскі (гушкаліся збоку ўбок) [16, с. 56]. Да зыбкі прывязвалася так званая "почапка", цягаючы за якую зыбку гушкалі [3, с. 3]. Калыскі на ножках пачалі ўваходзіць у сялянскі побыт у канцы XIX – пачатку XX стст. Дугападобныя ножкі такой калыскі звычайна аббіваліся сукном, каб калыска не стукала па падлозе, калі качалася [2, с. 9.]. Адсюль, напэўна, і назва такой калыскі – *"качанка"("качалка").* Беларускія сялянкі выпрацавалі вельмі прыдатны спосаб пераносу дзяцей за плячыма ў палатнянай або плеценай калысцы.

Для авалодання тэхнікай цела ў некаторых народаў існуюць пэўныя спосабы і прыстасаванні [11, с. 253-254]. Так, прысаджваць дзіця беларускія жанчыны пачыналі ў 4-х месячным узросце, а ставіць на ножкі ў 6 – 7 месяцаў, для чаго выкарыстоўвалі спецыяльныя прыстасаванні – *"сядзёлкі" і "стойкі" ("стаёнкі", "стаёлкі")* з прычэпленымі да іх цацкамі [17, с. 141]. Часта дзяцей саджалі ў "падушкі", прывязваючы іх "за падпахі" поясам, і пакідалі без дагляду на некаторы час, спадзяючыся на прыказку: "Малога і анёл калыша" [3, с. 1]. Для навучання хадзьбе выкарыстоўвалі так званую *"хадулю" ("хадунок", "пахадзенька", "хадун")*, якая мела выгляд вертыкальнай жэрдкі, замацаванай у столі, да якой на вышыні 60 – 80 см ад падлогі прымацоўваўся абручык *("каблучок")*, у цэнтры якога ставілі дзіця [4, с. 3]. Такім чынам, наяўнасць традыцыйнай дзіцячай мэблі, яе канструкцыя, накіраваная на стварэнне прыдатных умоў для сталення дзіцяці, ахоўная функцыя калыскі сведчаць аб існаванні ў беларускай культуры ўстойлівага ўяўлення аб каштоўнасці дзіцячага жыцця, аб асэнсаванні важнасці і адметнасці першага перыяду дзяцінства.

Асаблівасці дзіцячага харчавання і адзення ў беларускіх сялян, традыцыйныя сродкі прафілактыкі і лячэння дзіцячых хвароб, спецыяльныя спосабы і сродкі для авалодання тэхнікай цела

сведчаць аб тым, што традыцыйныя спосабы і сродкі забеспячэння здароўя дзяцей з’яўляліся асобнай часткай традыцыйнай культуры першаснага жыццязабеспячэння беларусаў.

## Выкарыстаная літаратура

1. Альхимович, П.Ф. Сборник белорусских народных легенд, былин и песен с описанием некоторых обрядов, обычаев, праздников и игрищ крестьян Себежского уезда Витебской губернии. / П.Ф. Альхимович // Описание рукописей учёного архива Императорского русского географического общества / под ред. Д.К. Зеленина. – Вып. 1. – Петроград : Тип. А.В. Орлова, 1914. – 483 с.

2. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НА НБ. – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 137.

3. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НА НБ – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 138.

4. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НА НБ – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 139.

5. Бабуля так лячыла...: замовы ад хвароб. / склад. Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 53 с.

6. Байбурин, А.К. Пояс (к семиотике вещей). / А.К. Байбурин // Сборник музея антропологии и этнографии. – Т. 45. – СПб. : Наука, 1992. – 197 с. – С. 5–13.

7. Белорусы. / Рос. акад. наук, Ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая, Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы; отв. ред. : В.К. Бондарчик [и др.]. – М.: Наука, 1998. – 502 с.

8. Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія. / М. Говард; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск: Тэхналогія, 1995. – 478 с.

9. Головин, В.В. Организация пространства новорожденного. / В.В. Головин // Родины, дети, повитухи в традициях народной культуры: сб.ст. / Рос. гос. гуманитар. ун-т, Ин-т высш. гуманитар. исслед.; сост. Е.А. Белоусова; отв. ред. С.Ю. Неклюдов. – М., 2001. – 318 с. – С. 31–60.

10. Малиновский, Б. Научная теория культуры. / Б. Малиновский – М.: ОГИ, 2005. – 184 с.

11. Мосс, М. Общества. Обмен. Личность: труды по социальной антропологии. / М. Мосс. / пер. с фр., послесл. и коммент. А.Б. Гофмана. – М.: Изд. фирма «Вост. лит», 1996. – 360 с.

12. Навагродскі, Т.А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стст.: аўтарэферат дыс. … канд. гіст. нав.: 07.00.07 – Мінск, 2015. – 50 с.

13. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности. / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская тип., 1895. – 154 с.

14. Покровский, Е.А. Физическое воспитание детей у разных народов преимущественно России. / Е.А. Покровский // Известия императорского общества любителей естествознания, антропологии и этнографии. – 1884. – Т. 45. – Вып. 2. – 232 с.

15. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края. / П.В. Шейн. – Т. 3. – СПб.: Тип. Императорской Академии наук, 1902. – 535 с.

16. Яцкевіч, Т. Вярбовы корчык, або чаму нельга гушкаць пустую калыску. / Т. Яцкевіч // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 4. – С. 56 – 58.

17. Яцкевіч, Т.Д. Традыцыйная дзіцячая мэбля беларусаў і яе роля ў першапачатковым фізічным выхыванні. / Т.Д. Яцкевіч // Традыцыйная фізічная культура беларусаў: гісторыя, тэорыя, практыка: матэрыялы II Рэсп. канф. па праблемах традыц. фіз. культуры беларусаў, Мінск, 15–16 крас. 1999 г. / БДПУ ім. М. Танка; рэдкал. Л.Н. Ціхаміраў [і інш.] – Мінск, 1999. – С. 140–142.